Wyd. II przejrzane. – Lwów: Nakł. Księgarni H. Altenberga, 1903. – 96, [1] s.
27. *Pobóg-Malinowski, W.* Najnowsza historia polityczna Polski. T. 1, Okres 1864–1914. Cz. 1, [Po klęsce styczniowej] / W. Pobóg-Malinowski. – Gdańsk: «Graf», 1991. – 404 s., [12] s. tabl.: faks., fot., portr.
28. *Kieniewicz, S.* Warszawa w latach 1795–1914 // Dzieje Warszawy / pod red. S. Kieniewicza. – T. III. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1976. – 384 s.
29. *Szwarc, A.* Od Wielopolskiego do stronnictwa polityki realnej: zwolennicy ugody z Rosją, ich poglądy i próby działalności politycznej (1864–1905) / A. Szwarc. – Warszawska: Oficyna Wydawnicza «Gryf», 1996. – 331 s.
30. *Долбилов, М. Д.* Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – М.: Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.: ил. – (Historia Rossica).

31. *Сидоров, А. А.* Русские и русская жизнь в Варшаве. (1815–1895): ист. очерк: (Со снимками с картин, портретов и медалей): В 3 вып. – Варшава: Тип. Губ. правл., 1899–1900. – Вып. 1. – 1899. – 68 с.: портр., ил.; Вып. 2. – 1899. – 60 с.: портр., ил.; Вып. 3. – 1900. – 58 с.: портр., ил.
32. *Гурко, В. И.* Очерки Привислянья / В. И. Гурко. – М.: Тип. В. В. Чичерина, 1897. – 376 с.
33. *Zaleski, A.* Towarzystwo warszawskie. Listy do przyjaciółki przez Baronową X.Y.Z / oprac. R. Kołodziejczuk. – Warszawa: Wydawnictwo PIW, 1971. – 615 s. – Seria wydawnicza: Biblioteka Syrenk.

**(Дата падачы: 11.02.2019 г.)**

*В. Э. Лук'янчук*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*V. Lukyanchuk*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)**

# СТАН РАЗВІЦЦЯ РАМЕСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў ГАРАДАХ І МЯСТЭЧКАХ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

# THE STATE OF CRAFT PRODUCTION DEVELOPMENT IN CITIES AND TOWNS OF THE MINSK PROVINCE IN THE SECOND PART OF THE XIX$^{TH}$ – THE BEGINNING OF THE XX$^{TH}$ CENTURY

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці развіцця рамеснай вытворчасці ў гарадах і мястэчках Мінскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Аўтар аналізуе стан эканамічнага развіцця губерні адносна іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. На падставе статыстычных дадзеных прыводзіцца дынаміка росту колькасці гарадскіх рамеснікаў Мінскай губерні, параўноўваюцца тэмпы развіцця гарадскога і мястачковага рамяства. Паказана далейшая спецыялізацыя вытворчасці, зроблены аналіз змены ўдзельнай вагі рамеснікаў асобных спецыяльнасцей.*

*Ключавыя словы: рамесная вытворчасць, гарадское і местачковае рамяство,*

*спецыялізацыя.*

*The article discusses the features of the development of craft production in cities and towns of the Minsk province in the second part of the XIXth – the beginning of the XXth century. The author analyzes the state of economic development of the province in relation to other regions of the Russian Empire. Based on statistical data the author shows the dynamics of growth of the number of the Minsk province urban artisans, compares the rate of development of urban and district craft. The further specialization of production has been displayed and an analysis of changes in the proportion of individual artisan specialties made.*

*Key words: craft production, urban and district craft, specialization.*

Сучасныя беларускія гісторыкі, характарызуючы сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі другой паловы XIX ст. – пачатку XX ст., усё часцей звяртаюцца да асаблівасцей развіцця прамысловасці, як да фактара мадэрнізацыйных працэсаў на шляху фарміравання індустрыяльнага грамадства на Беларусі. Вядома, што ў сваім развіцці прамысловасць прайшла стадыі рамяства, дробнатаварнай, мануфактурнай і фабрычна-заводскай вытворчасці. На тэрыторыі беларускіх губерняў працэс індустрыялізацыі ў другой палове XIX ст. – пачатку XX ст. адбываўся больш павольнымі тэмпамі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Рамесная вытворчасць атрымала далейшае развіццё. Аб гэтым сведчаць паказчыкі росту

| Губерня | Па колькасці прадпрыемстваў | | Па суме вытворчасці | | Па колькасці рабочых | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1861 год *(месца сярод 66 рэгіёнаў)* | 1890 год *(месца сярод 50 рэгіёнаў)* | 1861 год *(месца сярод 66 рэгіёнаў)* | 1890 год *(месца сярод 50 рэгіёнаў)* | 1861 год *(месца сярод 66 рэгіёнаў)* | 1890 год *(месца сярод 50 рэгіёнаў)* |
| **Віленская** | 48 | 36 | 45 | 35 | 40 | 38 |
| **Віцебская** | 36 | 19 | 49 | 43 | 48 | 41 |
| **Гродзенская** | 12 | 14 | 28 | 31 | 30 | 22 |
| **Магілёўская** | 27 | 31 | 40 | 39 | 33 | 43 |
| **Мінская** | 55 | 27 | 48 | 34 | 44 | 42 |

**Расійскай імперыі ў 1861 г. і 1890 г.[1]**

Яскравым паказчыкам слабасці эканамічнага развіцця зямель з'яўляецца колькасць рабочых на адно прадпрыемства (табл. 2). Калі ў сярэднім па

[1]Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе: [1, с. 101], [2, с. VII].

Расіі ў сярэдзіне XIX ст. на адным прадпрыемстве працавала каля 37 чалавек і выраблялася прадукцыі больш, чым на 19 тыс. рубл., то і ў канцы XIX ст. беларускія губерні не дасягнулі гэтага паказчыка [3, с. 103].

Дадзеныя паказчыкі сведчаць аб тым, што у агульным памеры вытворчасці ў канцы XIX ст. вага рамеснай і дробнатаварнай была дастаткова значнай.

На сённяшні дзень асноўнай крыніцай звестак аб колькасці прамысловых прадпрыемстваў, колькасці занятых у вытворчасці чалавек ў другой палове XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца статыстычныя ведамасці, якія абагульняліся статыстычнымі камітэтамі губернскіх гарадоў Расіі і прыкладаліся да штогадовых справаздач губернатараў. Мінскі губернскі статыстычны камітэт быў адкрыты 9 снежня 1963 года [4]. Статыстычныя камітэты выдавалі «Памятныя кніжкі» – афіцыйныя даведачныя выданні.

*Табліца 2*

**Колькасць рабочых на прамысловых прадпрыемствах беларускіх губерня[1]**

| Губерня | Колькасць рабочых на адно прадпрыемства | |
|---|---|---|
| | 1861 год | 1890 год |
| Віленская | 21 | 14 |
| Віцебская | 5 | 8 |
| Гродзенская | 13 | 23 |
| Магілёўская | 11 | 9 |

| Горад | 1858 | 1887 | 1889 | 1894 | 1896 | 1897 | 1899 | 1900 | 1906 | 1908 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 190 | 287 | 419 | 476 | 643 | 838 | 944 | 961 | 882 | 742 |
| Докшыцы | 33 | н.зв. | 223 | 212 | 228 | 642 | н.зв. | 251 | 322 | 286 |
| Ігумен | 209 | 151 | 286 | 342 | 396 | 418 | 433 | 470 | 296 | 285 |
| Мазыр | 317 | 144 | 340 | 304 | 370 | 434 | 574 | 631 | 1371 | 859 |
| Навагрудак | 185 | 134 | 292 | 390 | 494 | 474 | 527 | 558 | 544 | 620 |
| Нясвіж | 145 | н.зв. | 215 | 268 | 475 | 230 | 324 | 347 | 245 | 325 |
| Пінск | 669 | 977 | 1973 | 2345 | 2052 | 2193 | 2188 | 2140 | 2743 | 2762 |
| Рэчыца | 249 | 148 | 305 | 355 | 572 | 640 | 767 | 687 | 806 | 874 |
| Слуцк | 358 | 327 | 432 | 683 | 758 | 834 | 893 | 1063 | 1049 | 1167 |
| Разам | 4373 | 4554 | 9796 | 11551 | 12203 | 13163 | 14207 | 15266 | 17289 | 16484 |
| Мінск | 1651 | 1389 | 4174 | 4806 | 4442 | 4694 | 5564 | 5985 | 6852 | 6289 |
| Бабруйск | 367 | 997 | 1188 | 1370 | 1773 | 1766 | 1993 | 2173 | 2179 | 2275 |

[1] Складзена на падставе тых жа даных, што і табліца 1.

[2] Табліца складзена аўтарам артыкула на падставе дадзеных: [5], [6], [7], [8], [9], [10], [11], [12], [13, с. 82], [14].

Статыстычныя звесткі дазваляюць зрабіць выснову, што ў 1850-я – 1880-я гг. колькасць рамеснікаў у гарадах Мінскай губерні была амаль што нязменнай (у 1858 г. – 4373, у 1887 г. – 4554) (табл. 3). Нязначнае павелічэнне колькасці рамеснікаў з 1858 па 1887 г. адбылося толькі ў трох гарадах: у Бабруйску (з 367 па 997 чалавек), у Барысаве (з 190 па 287 чалавек), у Пінску (з 669 па 977 чалавек). Памяншэнне колькасці рамеснікаў назіралася ў Мінску, Ігумене, Мазыры, Навагрудку, Рэчыцы, Слуцку. Дадзеныя лічбы характарызуюць замаруджаныя тэмпы развіцця эканомікі ў першыя два парэформенныя дзесяцігоддзі. Адсутнасць станоўчай дынамікі ў павелічэнні колькасці рамеснікаў у гарадах тлумачыцца яшчэ і прамысловымі крызісамі 1873–1875 гг. і 1881–1882 гг., калі пакупныя здольнасці насельніцтва падалі, а сяляне, асноўныя спажыўцы тавараў, вымушаны былі самі вырабляць прадметы рамеснай вытворчасці.

З 1887 па 1906 г. назіраецца рост колькасці рамесніцкага насельніцтва гарадоў: калі ў 1887 г. у гарадах Мінскай губерні пражывала 4554 рамеснікаў, то ў 1906 г. – 17 289. Пры гэтым з 1887 па 1889 г. колькасць рамесніцкага насельніцтва гарадоў губерні павялічылася больш, чым у 2 разы (з 4554 да 9796 чалавек). Найбольш значна ў 1887–1906 гг. павялічылася колькасць рамесніцкага насельніцтва ў Мінску (з 1389 да 6852 чалавек), у Мазыры (з 144 да 1371 чалавека), у Рэчыцы (з 148 да 806 чалавек), у Пінску (з 977 да 2743 чалавек).

Такім чынам, колькасць гарадскіх рамеснікаў Мінскай губерні ў 1858–1906 гг. павялічылася з 4373 да 17 289 чалавек (амаль у 4 разы). У той час як агульная колькасць гарадскога насельніцтва павялічылася з 90 226 да 261 212 чалавек (амаль у 3 разы) [13, с. 92]. Гэты паказчык сведчыць не толькі аб далейшым развіцці рамяства, але і аб яго пашырэнні.

Упершыню зніжэнне колькасці рамеснікаў у гарадах Мінскай губерні назіраецца ў 1908 годзе – 16 464 чалавек (у 1906 годзе – 17 289 чалавек) [14]. Аналіз статыстычных дадзеных адлюстроўвае сувязь гэтых паказчыкаў са змяншэннем агульнай колькасці насельніцтва гарадоў губерні (у 1906 годзе – 261 212 чалавек, у 1908 годзе – 258 303 чалавек) [15, с. 93].

Калі параўнаць звесткі аб колькасці насельніцтва па гарадах Мінскай

губерні, атрыманыя ў выніку Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года са статыстычнымі звесткамі аб колькасці рамеснікаў у гарадах Мінскай губерні, то атрымаем інфармацыю аб распаўсюджанасці занятка ў гарадах [16], [17]. Так, у Нясвіжы каля 3% насельніцтва займалася рамяством (1 рамеснік прыходзіўся на 37 жыхароў горада); у Мінску, Бабруйску, Мазыры 5 % насельніцтва займалася рамяством (1 рамеснік прыходзіўся на 19 жыхароў горада); у Барысаве, Навагрудку, Пінску, Слуцку – 6 % (1 рамеснік прыходзіўся на 17 жыхароў горада); у Рэчыцы –7 % (1 рамеснік прыходзіўся на 15 жыхароў горада); у Ігумене – 9 % (1 рамеснік прыходзіўся на 11 жыхароў горада)[1]. Аўтар артыкула ставіць пад сумненне дакладнасць статыстычных дадзеных па колькасці рамеснікаў у горадзе Докшыцы за 1897 год [17, с. 29]. Агульная дынаміка росту колькасці рамеснікаў сведчыць пра тое, што была дапушчана тэхнічная памылка (больш верагодная колькасць рамеснікаў не 642, а 242).

Аналіз статыстычных дадзеных адлюстроўвае яшчэ адну тэндэнцыю характэрную для развіцця рамяства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. – паступовы рост колькасці рамеснікаў, якія пражывалі ў мястэчках, у параўнанні з гарадскім рамесным насельніцтвам. У 1860 гадах па звестках А. М. Лютага, А. Э. Лютай, Л. Э. Пракаповіч больш распаўсюджаным было гарадское рамяство, то ў 1886 годзе суадносіны колькасці рамеснікаў у гарадах і паветах склалі 58 % і 42 % адпаведна, у 1895 годзе – 37 % і 63 %, а ў 1909 годзе – 24 % і 76 %[2] [18, с. 58]. Павелічэнне колькасці рамесных майстэрняў, якія знаходзіліся ў мястэчках, у параўнанні з гарадскімі, супадае па часу з перыядам найбольш інтэнсіўнага росту фабрычна-заводскай вытворчасці. Жадаючы пазбегнуць канкурэнцыі з збоку вытворчасці буйной прамысловасці, рамеснікі размяшчаюць свае прадпрыемствы бліжэй да крыніц сыравіны – у сельскай мясцовасці.

Адпаведна спецыялізацыі вытворчасці ў статыстычных звестках «Аб колькасці рамеснікаў у гарадах» рамеснікі падзяляліся на 4 асноўныя групы. Так, па Мінскай губерні ў 1858 годдзе большасць рамеснікаў займалася вырабам прадметаў адзення (краўцы, шаўцы, мадысткі, капялюшнікі – 51 %)[3]. На другім па колькасці месцы знаходзілася група рамеснікаў, якія выраблялі прадметы хатняга ўжытку (печнікі, сталяры, меднікі, рымары, карэтнікі – 18 %). На трэцім месцы – тыя рамеснікі, якія выраблялі прадметы харчавання (хлебнікі, булачнікі, мяснікі, кандытары – 16 %). Прадстаўнікоў іншых спецыяльнасцей было каля 15 % (фурманы, канавалы, гадзіншчыкі). Больш за ўсіх па спецыяльнасцях у Мінскай губерні на 1858 год было краўцоў (26 %), шаўцоў (18 %), хлебнікаў (8 %). Такая рамесная

[1] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе [16, с. 1], [17, с. 29].

[2] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе [11], [12], [13, с. 63].

[3] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе [19].

спецыяльнасць як пернічнікі сустракалася выключна ў Барысаве і Мазыры.

У ведамасці «Аб колькасці рамеснікаў у гарадах Мінскай губерні за 1886 год» пералік спецыяльнасцяў у параўнанні з аналагічным за 1858 год пашырыўся з 17 да 31 назвы. З'явіліся такія рамесніцкія спецыяльнасці як пальчатачнікі, камінары, цесляры, бондары, слесары, кавалі, бляхары, збройнікі, фарбоўшчыкі, шкляры, сярэбраннікі, разьбяры, літографы, фатографы. Змянілася ўдзельнага вага кожнай з груп рамесніцкіх спецыяльнасцей. Так, група, якая ў сярэдзіне ХІХ ст. займала другое месца (вырабы прадметаў хатняга ўжытку) ў 1886 годзе выйшла на першае месца (49 % усіх рамеснікаў)[1]. На другім месцы апынулася група рамеснікаў, якія займаліся вырабам прадметаў адзення (28 %), на трэцім – прадметаў харчавання (16 %), на чацвёртым – прадстаўнікі іншых спецыяльнасцей (6 %). Па асобных спецыяльнасцях больш за ўсіх іншых рамеснікаў было занята вырабам абутку (шаўцы – 14 %), цеслярскай справай займаліся 11 % ад агульнай колькасці ўсіх рамеснікаў, 10 % ад занятых рамяством складалі краўцы.

У пачатку ХХ ст. (звесткі за 1908 год), як і напрыканцы ХІХ ст., група рамеснікаў, якія займаліся вырабам прадметаў хатняга ўжытку была на першым месцы па агульнай вазе сярод усіх спецыяльнасцяў – 38 %. Другое па колькасці месца захоўвалі рамеснікі, якія займаліся вырабам прадметаў адзення (21 %). На трэцім месцы апынуліся прадстаўнікі, тых спецыяльнасцяў, якія не ўваходзілі ў асноўны пералік (фурманы і канавалы – 16 %), на чацвёртым месцы – хлебнікі, булачнікі, мяснікі, кандытары (15 %)[2].

Калі гарады з'яўляліся цэнтрам развіцця разнастайнай рамеснай вытворчасці, то мястэчкі Беларусі другой паловы ХІХ ст. – пачатку ХХ ст. спецыялізаваліся на вырабе асобнай прадукцыі. Так, гарбарнае і шавецкае рамяство было больш распаўсюджана ў Рэчыцкім павеце, вырабамі з саломы больш шырока займаліся ў Мазырскім павеце, на вырабе глінянага посуду больш, чым у іншых паветах спецыялізавалася насельніцтва Пінскага і Мінскага паветаў, драўляных вырабаў – Пінскага павета [22, с. 73].

У другой палове ХІХ ст. у гарадах і мястэчках значная частка рамеснікаў, як і раней, была аб'яднана ў цэхі – прафесійную арганізацыю (карпарацыю), створаную з мэтай манапалізацыі рамяства і для супольнага адпраўлення некаторых жыццёвых функцый. Цэх быў іерархічнай арганізацыяй і складаўся з вучняў, падмайстраў (чэляднікаў), майстраў, адносіны паміж якімі рэгуляваліся статутам. На чале цэхаў стаялі старшыя майстры або цэхмайстры, якія, адпаведна артыкулу 58 рамеснага статута, павінны былі быць хрысціянамі [23]. Усе цэхі ў горадзе падпарадкоўваліся рамеснай управе. Цэхмайстры разам з прадстаўнікамі цэхаў выбіралі Галаву. Гэтая кандыдатура павінна была быць узгоднена з гарадской адміністрацыяй. У першай палове ХІХ ст. цэхі паступова страчвалі свой уплыў на развіццё

[1] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе [20]
[2] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе [21].

рамяства. Таму ў 1852 г. Сенат выдаў указ аб ліквідацыі цэхавай арганізацыі ў гарадах і мястэчках, дзе колькасць рамеснікаў была нязначнай. У такіх гарадах можна было займацца рамяством, запісаўшыся ў рамеснае саслоўе, не ўваходзячы ў цэх. Таму, у другой палове XIX ст. колькасць рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, значна перавышала колькасць цэхавых.

Сярод фондаў НГАБ ёсць фонд Мінскай агульнай рамеснай управы (фонд 10). Ён утрымлівае кнігі пастаноў управы, спісы рамеснікаў па рамёствам г. Мінска, звесткі аб выдачы пасведчанняў на званне майстроў і іншых работнікаў цэхаў і інш. Так, спіс рамеснікаў і рамесных работнікаў па рамёствах Мінска за 1887 год утрымлівае звесткі аб існаванні 26 цэхаў. Сярод іх самымі шматлікімі па колькасці майстроў былі: сталярны цэх – 326 майстроў, шавецкі – 181 майстар, мулярны – 142 майстра, кравецкі – 99 майстроў, медны – 91 майстар, булачна-кандытарска-паварскі – 91 майстар. Цэхі, з самай меншай колькасцю майстроў – парыкмахерскі, камінарскі, пераплётны (па 21 майстры); сітна-рашотны – 13 майстроў; канатны – 7 майстроў [24].

Асноўным заняткам насельніцтва Мінскай губерні ў другой палове XIX ст. працягвала заставацца земляробства. Рамеснай вытворчасцю займалася амаль што выключна яўрэйскае насельніцтва. Шматлікія звесткі ўказваюць на тое, што яўрэі «сканцэнтравалі ў сваіх руках увесь гандаль, прамысловасць, промыслы і рамяство» [25]. Аднак, у 1876 годзе новы губернатар Мінскай губерні Валерый Іванавіч Чарыкаў выдаў распараджэнні аб адкрыцці пры народных вучылішчах рамесных класаў. Разам па ўсіх паветах губерні было адкрыта 80 рамесных класаў, у якіх навучаліся 580 хлопчыкаў і 22 дзяўчынкі [22, с.77]. Найбольш пашырана было навучанне шавецкай, сталярнай, кавальскай, кравецкай справе.

Вядома, што 19 студзеня 1875 года была адкрыта рамесная школа пры Мінскім Свята-Духавым манастыры. Школа была заснавана як з мэтай навучання сіротаў, якія не жылі ў прытулках, так і з мэтай пашырэння рамяства сярод праваслаўнага насельніцтва краю. На канец 1876 года вучняў у школе было ўсяго 10: па 5 чалавек на сталярным і пераплётным аддзяленнях. Навучанне здзяйснялі 2 майстры-настаўнікі. Першапачаткова статутам школы быў вызначаны двухгадовы тэрмін навучання, які пазней быў зменены на чатырохгадовы. Найбольш прыбытковай была работа пераплётнага адзялення школы. Так, у 1877 годзе вучні гэтага аддзялення выканалі заказаў на суму 730 р. 86 к. У той час, як вучні сталярнага адзялення – на 292 р. 14 к. [22, с. 94].

Такім чынам, на прыкладзе Мінскай губерні знайшлі адлюстраванне асноўныя тэндэнцыі, характэрныя для развіцця рамяства на Беларусі ў другой палове XIX ст. – пачатку XX ст.: далейшы рост колькасці рамеснікаў (памяншэнне тэмпаў росту – пачатак XX ст.), перавага з 90-х гадоў XIX ст. мястачковага рамяства над гарадскім, далейшае павелічэнне колькасці рамесных спецыяльнасцяў у афіцыйнай статыстыцы, змена

ўдзельнай вагі рамеснікаў асобных спецыяльнасцяў (у сярэдзіне XIX ст. большасць рамеснікаў была занята вырабам прадметаў адзення, у пачатку XX ст. – вырабам прадметаў хатняга ўжытку) і інш.

**Спіс выкарыстанных крыніц**


1. *Люты, А. М.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя: манаграфія / А. М. Люты. – Мінск, 2004. – 322 с.

2. *Орлов, П. А.* Указатель фабрик и заводов Европейской России / П. А. Орлов, С. Г. Будагов // Материалы для фабрично–заводской статистики; сост. по офиц. сведениям Департамента торговли и мануфактур за 1890 г. – СПб., 1894. – 850 с.

3. *Лютая, А.Э.* Роль и место ремесла в процессе генезиса капитализма в Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX вв. / А. Э. Лютая. – Минск, 2006. – 116 с.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 21. – Воп. 1.

5. Памятная кніжка Мінскай губерні за 1860 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Губ. Тыпаграфія, 1860. – С. 88–91.

6. Памятная кніжка Мінскай губерні за 1889 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Губ. Тыпаграфія, 1888. – С. 255.

7. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1891 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Тыпа-Літаграфія Б. Н. Саламонава, 1890. – С. 222.

8. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1896 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Тыпа-Літаграфія Х. Дворжэца і Б. Саламонава, 1895. – С. 47.

9. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1898 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Паравыя тыпа-літ. Х. Дворжэца і Б. Саламонава, 1897. – С. 29.

10. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1899 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Паравыя тыпа-літ. Х. Дворжэца і Б. Саламонава, 1898. – С. 29.

11. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1901 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Губ. Тыпаграфія, 1900. – С. 4.

12. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1902 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Паравая тыпа-літ. Б. Саламонава, 1901. – С. 117.

13. Памятная кніжка для Мінскай губерні за 1908 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Тыпаграфія С.А. Някрасава, 1907. – 161 с.

14. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 118 – Л. 533, 548, 568, 616, 629, 666, 678, 687, 759.

15. Памятная книжка Минской губернии на 1910 год. Издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Типография губернского правления, 1909. – 382 с.

16. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г./ под ред. (и с предисл.) Н. А. Тройницкого. – СПб., Изд. Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел , 1899–1905. – Минская губерния. – 1904. – 243 с.

17. Памятная кніжка Мінскай губерні за 1899 год. Складзены і выдана Мінскім губерскім статыстычным камітэтам. – Мінск: Паравыя тыпа-літ. Х. Дворжэца і Б. Саламонава, 1898. – 410 с.

18. *Пракапович, Л. Э.* Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. / Л. Э. Пракапович. – Минск: БГПУ, 2010. – 156 с.

19. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 6. – Л. 100, 142, 144, 177, 211, 255, 289, 392, 513.
20. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 37. – Л. 6–8.
21. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 74. – Л. 26–31.
22. Памятная кніжка Мінскай губерні за 1878 год. – Мінск: Тыпаграфія губернскага праўлення, 1878. – Ч. 1. – 681 с.
23. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 108. – Л. 7.
24. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 384. – Л. 1.
25. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 118. – Л. 556.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*А. С. Ляневіч*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*A. Lianevich*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(4):796**

# СТАНАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ СІСТЭМЫ РЭГУЛЯВАННЯ СФЕРЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ Ў ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

# FORMATION OF THE STATE SYSTEM OF REGULATION OF THE SPHERE OF PHYSICAL CULTURE AND SPORTS IN THE SECOND REPUBLIC OF POLAND

*У артыкуле разгледжана гісторыя станаўлення дзяржаўнай сістэмы рэгулявання спартыўнай сферай ў Другой Рэчы Паспалітай. Вылучаны асноўныя моманты фарміравання дзяржаўных інстытутаў у галіне фізічнай культуры і іх нарматыўнай базы міжваеннай Польшчы, цэнтральнага апарата і рэгіянальных структур.*
*Ключавыя словы: фізічная культура і спорт; Другая Рэч Паспалітая; Міністэрства; Дзяржаўнае рэгуляванне; Ваенная падрыхтоўка; Алімпійскія гульні.*

*The article describes the history of the formation of the state system of regulation of the sports sphere in the Second Republic of Poland. Highlighted the main points of the formation of state institutions in the field of physical culture and their regulatory framework of interwar Poland, central administration and regional structures.*
*Key words: physical culture and sport; Second Republic of Poland; Ministry; State regulation; Military training; Olympic sports.*

У першай палове XX стагоддзя спорт пачынае займаць адно з асноўных месцаў у культурным і сацыяльным жыцці грамадства Другой Рэчы Паспалітай. Акрамя непасрэдна фізічнага выхавання ў навучальных установах, структурах падпарадкаваных Міністэрству вайсковых спраў (Ministerstwo Spraw Wojskowych), стварэнне спартыўных клубаў і спартыўна-патрыятычных аб'яднанняў спрыяла прыцягненню шырокіх мас грамадства ў спартыўную сферу і развіццю разнастайных яго відаў.

Неабходна дадаць, што ў перашай палове XX стагоддзя фізічнаму вы-